УДК 94(100):94(476):342(4)

# Крыніцы агульнай гісторыі і гісторыі Беларусі аб утварэнні дзяржаўнасці на землях усходніх славян: іх навуковая надзейнасць, ідэалагізацыя і палітызацыя

**_Мандрык І.У._**

_Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава", Віцебск_

_Артыкул падрыхтаваны шляхам перакрыжаванага аналізу шматлікіх друкаваных крыніц, у якіх асвятляецца працэс утварэння палітычных структур дзяржавы ва ўсходніх славян і яе першапачатковай назвы. Разгледжаны самыя дыскусійныя пытанні, якія вядуцца па праблеме прысутнасці варагаў на тэрыторыі Старажытнай Русі, іх значэнні для фарміравання тут дзяржаўнасці, а таксама аб паходжанні беларускай дзяржавы і яе эвалюцыі. Указваецца на недастатковую навуковую распрацаванасць дадзенай тэмы і сур'ёзныя метадалагічныя цяжкасці пры яе даследаванні, што звязана з мноствам поглядаў, іх недакладнасцямі і палітызацыяй._

_Мэта артыкула – высвятленне сапраўднасці выкладзеных у крыніцах агульнай гісторыі і гісторыі Беларусі фактаў аб фарміраванні і развіцці нацыянальна-дзяржаўных утварэнняў на Русі._

**_Матэрыял і метады._** _Выкарыстаны шматлікія замежныя і айчынныя гістарычныя крыніцы, у якіх разглядаецца працэс утварэння і станаўлення дзяржаўнасці і дзяржаў ва ўсходніх славян, а таксама з'яўлення выкладзеных на сёння канцэпцый аб утварэнні і эвалюцыйным станаўленні беларускай дзяржавы. Даследаванне праводзілася на аснове комплекснай сістэмы метадаў: храналагічнага, рэтраспектыўнага, аналізу, актуалізацыі, аўтарскіх высноў._

**_Вынікі і іх абмеркаванне._** _Расійскія і беларускія гісторыкі, навукоўцы іншых краін прысвяцілі шмат намаганняў стварэнню канцэпцый пра з'яўленне перадумоў для дзяржаўнага аб'яднання славянскіх плямён, даследаванню ролі варагаў у фарміраванні раннефеадальнай старажытнарускай дзяржавы з назвай Русь, вытокам беларускай дзяржавы і яе эвалюцыі. У артыкуле звяртаецца ўвага на тое, што ў друкаваных раней крыніцах яшчэ і на сёння пры апісанні дадзенага гістарычнага этапа нашай мінуўшчыны наглядаюцца сур'ёзныя недакладнасці, схематызм, а то і проста блытаніна. З улікам усіх даследаванняў аўтар праводзіць іх аналіз, выказвае ўласныя меркаванні, робіць асабістыя высновы._

**_Заключэнне._** _Калі браць пад увагу ўсе, што існуюць на гэты момант, навуковыя погляды аб утварэнні і эвалюцыйным станаўленні дзяржавы ва ўсходніх славян, можна ўбачыць, што дадзены гістарычны этап нашай агульнай мінуўшчыны яшчэ не мае глыбокага асэнсавання. Версіі і тлумачэнні гісторыкаў носяць аўтарскую інтэрпрэтацыю і даволі супярэчлівыя. Аўтар артыкула падтрымлівае канцэпцыю навукоўцаў аб тым, што паступовы пераход ад родаплемяннога ладу да класавага і дзяржаўнага на землях усходніх славян абумоўлены не з'яўленнем тут вікінгаў, а эканамічнымі, сацыяльнымі і палітычнымі фактарамі._

**_Ключавыя словы:_** _варагі, Кіеўская Русь, Новагародскае княства, Полацкае княства, Русь, старажытнаруская дзяржава, усходнеславянская дзяржава._

_(Ученые записки. – 2018. – Том 28. – С. 7–14)_

# General History and History of Belarus Sources on the Establishment of State in Eastern Slavonic Lands: their Scientific Reliability, Ideologization and Politization

**_Mandrik I.V._**

_Educational Establishment "Vitebsk State P.M. Masherov University", Vitebsk_

_The article is prepared by means of a cross-analysis of multiple edited sources which highlight the process of creating political structures of Eastern Slavonic state and its original name. Most controversial issues on the problem of the presence of enemies on the territory of Ancient Russia are considered, their significance in building up the state as well as the origin_

_Адрас для карэспандэнцыі: e-mail: ivan_mandrik@mail.ru_ – **_І.У. Мандрык_**

*of Belarusian state and its evolution. Insufficient research of this topic is pointed out as well as serious methodological shortcomings in studying it which is connected with multiple ideas, their indefiniteness and politization.*

*The purpose of the research is identification of the essence of the presented in General History and History of Belarus sources facts about the shaping and the development of national state establishments in Russia.*

***Material and methods.** Multiple foreign and domestic historical sources are used, in which the process of shaping and maturation of the phenomenon of state and states of Eastern Slavs is considered as well as the contemporary concepts of shaping and evolutionary maturation of Belarusian state. The research is based on a complex system of methods: the chronological, the retrospective analysis, actualization of author's concepts.*

***Findings and their discussion.** Russian and Belarusian historians, scholars form other countries made a lot of efforts to shape concepts about the creation of preconditions for the state union of Slavonic tribes, to study the role of enemies in shaping the early feudal Old Russian state which was called Russ (Russia), the sources of Belarusian state and its evolution. Attention is paid to the fact that in published earlier sources still nowadays there are serious mistakes, confusion and unclearness concerning the mentioned historical stage of our past. With the respect to all the researches, the author conducts their analysis, expresses his own ideas, and makes personal conclusions.*

***Conclusion.** Taking into account all existing scientific ideas about the creation and evolutional maturation of Eastern Slavonic state, we should understand the evidence that this historical stage of our common past hasn't been deeply considered yet. Historians' versions and interpretations are only authors' interpretations; they are rather contradictory. The author of the article supports the researchers' concept that a gradual transition from the tribal order to the class and state economy in Eastern Slavonic lands isn't conditioned by the intrusion of Vikings but by economic, social and political factors.*

***Key words:** Vikings, Kiev Russ, Novgorod Principality, Polotsk Principality, Russ (Russia), Ancient Russian state, Eastern Slavonic state.*

*(Scientific notes. − 2018. − Vol. 28. − P. 7−14)*

Расійскія, беларускія гісторыкі, навукоўцы іншых краін прыклалі шмат намаганняў для стварэння канцэпцый пра з'яўленне перадумоў для палітычнага аб'яднання славянскіх плямён, даследаванню ролі варагаў у фарміраванні раннефеадальнай старажытнарускай дзяржавы з назвай Русь, значэнню беларускіх княстваў у часы яе станаўлення.

Канцэпцыі па кожнай з названых праблем штогод удасканальваліся, але прызнаць іх цэльнымі пакуль нельга. Нягледзячы на вялікую колькасць навуковых прац, тут яшчэ шмат "белых плям", недакладнасцей, схематызму, а то і проста блытаніны, якія прыніжаюць гісторыю народа, узрошчваюць палітычныя недарэчнасці паміж краінамі. Прычыны гэтага, хутчэй за ўсё, знаходзяцца ў тым, што гістарычныя падзеі і факты IX–X стст. аб пачатку Русі, вызначэнні этнічнага паходжання тут княжацкай дынастыі, аб узаемаадносінах паміж тэрытарыяльнымі адзінкамі (княствамі) у гэтым рэгіёне, а таксама аб усіх баках станаўлення ўласнай беларускай дзяржавы, якія выкладзены ў рускіх летапісах, нешматлікіх грэчаскіх і скандынаўскіх пісьмовых выданнях, народных сказаннях, не з'яўляюцца надзейнымі. Тое, што адбывалася ў IX ст. і на больш ранім этапе на дадзенай тэрыторыі, знайшло сваё адлюстраванне ў пісьмовых крыніцах амаль на два стагоддзі пазней. Пры нізкім узроўні тагачаснай пісьменнасці і захаванасці інфармацыі прызнаць за імі навуковую дакладнасць магчыма толькі ўмоўна. Аўтары старажытных летапісаў карысталіся малазначымымі падрабязнасцямі таго, што адбывалася раней, да таго ж асэнсаванне фактычнага матэрыялу рабілася імі з пункту погляду існуючай на гэты момант сітуацыі і ідэалогіі ўлады.

Мэта даследавання – высвятленне сапраўднасці выкладзеных у крыніцах агульнай гісторыі і гісторыі Беларусі фактаў аб фарміраванні і развіцці нацыянальна-дзяржаўных утварэнняў на Русі.

**Матэрыял і метады.** Выкарыстаны тры часткі летапіснага зводу ("Аповесць мінулых гадоў", Кіеўскі і Галіцка-Валынскі летапісы), шматлікія замежныя і айчынныя гістарычныя крыніцы – манаграфіі, абагульняючыя працы па гісторыі Беларусі, артыкулы, у якіх разглядаецца працэс фарміравання і станаўлення дзяржаўнасці і дзяржаў ва ўсходніх славян, а таксама навуковыя канцэпцыі аб станаўленні і функцыянаванні палітычных інстытутаў і дзяржаўных устаноў на тэрыторыі Беларусі. Даследаванне праводзілася на аснове комплекснай сістэмы метадаў: храналагічнага, рэтраспектыўнага, аналізу, актуалізацыі, аўтарскіх высноў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** На сённяшні дзень у навуковай літаратуры склалася агульнае разуменне сутнасці тэрміна "дзяржава". Канстатуецца, што дзяржава – гэта ўніверсальная самастойная цэнтралізаваная сацыяльна-палітычная арганізацыя, якая мае сваю тэрыторыю, валодае адмысловымі механізмамі кіравання і прымусу для рэгулявання сацыяльных адносін і ажыццяўлення ўнутраных і знешніх функцый. Такая трактоўка фарміравалася на працягу доўгага часу. З тым, каб закласці тэарэтычныя асновы аб развіцці першых дзяржаўных утварэнняў, аб транс-

фармацыі іх эканамічных і палітычных сістэм, указаць прычыны, якія абумовілі гэты працэс у далёкай старажытнасці, яны збіралі канкрэтныя факты, праводзілі іх сістэматызацыю. Абагульняючы здабытыя гістарычныя матэрыялы, прыйшлі да высновы, што найважнейшымі абставінамі пры стварэнні дзяржаў народамі свету з'яўляюцца сацыяльна-эканамічныя: неабходнасць забеспячэння грамадскай вытворчасці, падтрымання ў грамадстве парадку, вядзенне абаронных і захопніцкіх войнаў і інш. У большасці выпадкаў, як занатавана ў значнай колькасці крыніц, указаныя вышэй прычыны ўздзейнічалі сукупна. У розных народаў пры гэтым прысутнічалі своеасаблівасць і дынаміка працэсаў дзяржаваўтварэння. У гэтай сувязі складваліся ўнікальныя версіі аб паходжанні дзяржавы і яе эвалюцыі.

Шмат намаганняў у даследаванні асноўных момантаў пры з'яўленні перадумоў для дзяржаўнага аб'яднання славянскіх плямён, высвятленні пытанняў аб ўтварэнні раннефеадальнай старажытнарускай дзяржавы з назвай Русь, яе эвалюцыі, вытоках беларускай дзяржавы прыкладзена расійскімі і беларускімі гісторыкамі, навукоўцамі іншых краін. Але неабходна прызнаць, што аўтарскія версіі і тлумачэнні гісторыкаў па дадзенай праблеме носяць пакуль даволі супярэчлівы характар. Тут шмат "белых плям", наглядаюцца сур'ёзныя недакладнасці, схематызм, а то і проста блытаніна, якія прыніжаюць гісторыю народа, а часам узрошчваюць палітычныя недарэчнасці паміж краінамі.

Адзначым: доўгі час у літаратурных крыніцах была распаўсюджана (не адкінута цалкам і зараз) версія, што асновы дзяржавы на Русі закладзены варажскай дружынай Рурыка. Гэтая версія трансфармавалася ў нарманскую тэорыю, якая даказвала экспарт дзяржаўнасці на Русь праз нарманаў [1].

Падмуркам для ўвядзення дадзенай тэорыі ў навуковы зварот паслужыў летапісны расказ пра прызванне на княжанне ў Ноўгарад у 862 г. варажскіх князёў Рурыка, Сінявуса і Трувора. Маецца тры варыянты гэтага расказа: Лаўрэнцьеўскі і Іпацьеўскі спісы "Аповесці мінулых гадоў" і Наўгародскі першы летапіс. Яны паведамляюць, што першапачаткова варагі бралі даніну з наўгародцаў, затым скандынаваў выгналі, аднак паміж плямёнамі (па Наўгародскім летапісе – паміж гарадамі) пачаліся міжусобіцы: «и воевати почаша сами на ся". Пасля чаго славені, крывічы, чудзь звярнуліся да варагаў са словамі: "Земля наша велика и обильна, а наряда (парадка) в ней нет. Да поидите княжить и валодати нами".

Летапіс апісвае гэты этап як час існавання на поўначы Русі міжплемяннай палітычнай федэрацыі, складзенай са славян, крывічоў і чудзі (ці меры), рознагалоссі ўнутры якой ("в'еста род на род") і вызначылі прызванне князя. Варагі адазваліся на прызыў "и изъбрашася 3 братья с роды своими": Рурык, сеўшы ў Ноўгарадзе, Сінявус – на Белавозеры і Трувор – у Ізборску. Указваецца і іншае месца, дзе спачатку прыпыніўся Рурык, – гэта Ладага. Тут ён, каб мець асабістую бяспеку і ў мэтах абароны ад нападаў на дадзеную вобласць іншых варагаў, будуе крэпасць [1, с. 263]. І толькі пасля смерці Сінявуса і Трувора Рурык пакінуў Ладагу, прыйшоў да Ільменю, паставіў горад над Волхавам, назваў яго Ноўгарадам і сеў тут княжыць і раздаваць гарады "мужам сваім" [2, с. 18].

На падставе рускіх летапісаў і старажытных скандынаўскіх саг нямецкія навукоўцы пры Пецярбургскай акадэміі навук Готліб Байер і яго аднадумцы Мілер і Шлёцер падрыхтавалі глебу для ўзнікнення нарманскай тэорыі аб паходжанні Рускай дзяржавы. Яны, як адзначаюць асобныя вучоныя, сфармулявалі ілжэнавуковую тэорыю экспарту дзяржаўнасці на Русь, сцвярджаючы, што старажытная руская гісторыя з'яўляецца часткай скандынаўскай гісторыі [3, с. 4, 26–27].

У XVIII–XIX стст. нарманскай тэорыі сталі прытрымліваца многія вядомыя расійскія гісторыкі. Шмат хто з іх дапускаў магчымасць самога факта прызвання іншаземных князёў у раннефеадальную дзяржаву. У навуковых творах В. Ключэўскага [4, с. 144], С. Салаўёва [5. с. 120–121], працах іншых гісторыкаў абгрунтаванне гэтай падзеі тлумачыцца тым, што існаванне сур'ёзных класавых супярэчнасцяў у палітычнай федэрацыі, складзенай са славян, крывічоў і чудзі, магчыма, патрабавала прысутнасці трэцяй нейтральнай у адносінах да варожых бакоў сілы. Не адмаўлялі таксама гэтыя, як і іншыя, навукоўцы, верагоднасці афармлення гвалтоўнага захопу ўлады варагамі ў якасці акта "добраахвотнага прызвання", аб чым не ўзгадваецца ў летапісных помніках. Тут вучоныя абапіраюцца на тое, што пачатковы звод усходнеславянскага летапісу "Аповесць мінулых гадоў" ("Повесть временных лет") складзены ў перыяд княжання Яраслава Мудрага (1019–1054), дапоўнены (каля 1113 г.) кніжным навукоўцам, манахам Кіева-Пячорскага манастыра Нестарам,

[1] Нарманы (ад сканд. *northman* – паўночны чалавек) – скандынавы, удзельнікі гандлёва-грабежніцкіх і заваявальных паходаў у Еўропе ў канцы VIII – сярэдзіне XI ст. Ва ўсходніх славян яны называліся варагамі, у самой Скандынавіі – вікінгамі.

калі Руская зямля выступала магутнай дзяржавай. Абставіны таго часу (моц Русі) не дазвалялі ўявіць сілавы захоп улады ў краіне, а варагаў як заваёўнікаў. Таму версія гвалтоўнага захопу ўлады варагамі ў гэтых крыніцах не ўзнікала. Не праявілася яна і ў пазнейшых творах: Лаўрэнцьеўскім (1377), Іпацьеўскім (пачатак XV ст.) летапісах.

Зразумела, у старажытных крыніцах маюць месца недакладнасці. Узяць хаця б гістарычны факт аб стварэнні Віцебска Вольгай. Віцебск, згодна з першым упамінаннем у летапісе, бярэ пачатак у 974 г. Вядома, што гэта не так: Вольгі ў гэты час ужо не было на гэтым свеце. Год яе смерці – 969. Таму яшчэ і сучасныя гісторыкі пры даследаванні старажытнага перыяду ўжываюць словы “відаць”, “хутчэй за ўсё”, “па нашай рэканструкцыі” і г.д.

Аднак нельга не заўважыць, што тэорыя аб прызванні варагаў на ўказаныя славянскія тэрыторыі “вучыць дзяржаўнасці” з моманту яе з’яўлення ўспрымалася вельмі востра, нараджала мноства крайніх адзнак і парадаксальных меркаванняў. Погляды навукоўцаў пры разглядзе пытанняў аб прысутнасці варагаў на тэрыторыі Старажытнай Русі, іх значэнні для фарміравання дзяржаўнасці разыходзіліся кардынальна. Тэорыя аб тым, што славяне не змаглі самі кіраваць на сваёй тэрыторыі, выклікала абгрунтаваную крытыку ў расійскім навуковым асяродку яшчэ ў час яе распрацоўкі. Першымі тут былі В.М. Тацішчаў і М.В. Ламаносаў. Калі В. Тацішчава магчыма прызнаць памяркоўным нарманістам (крытыкаваў нарманскую тэорыю, але абмяжоўваўся асобнымі нязначнымі заўвагамі, якія не парушалі цэльнасці канцэпцыі нямецкіх гісторыкаў), дык М. Ламаносаў наводзіў знішчальную крытыку ўсім асноўным палажэнням канцэпцыі “нарманскага пытання”, звязаным са Старажытнай Руссю. Апошні прыводзіць шэраг доказаў, якія мелі вялікае навуковае значэнне: ён абвяргае погляды замежных гісторыкаў аб адсталасці старажытнарускага народа ў параўнанні з іншымі насельнікамі Еўропы. На думку Ламаносава, старажытнаруская дзяржава існавала задоўга да прызвання варагаў у форме племянных саюзаў і асобных княстваў. Варагі – росы, як уяўляе Ламаносаў, – гэта адно са славянскіх плямён, якія жылі па ўсходне-паўднёвых берагах Варажскага мора паміж Віслай і Дзвіной. Таму няма нічога дзіўнага, што наўгародцы звярнуліся да сваіх суседзяў – славян. Для пацвярджэння ўласнага пункту погляду М. Ламаносаў указвае на адсутнасць слоў скандынаўскага паходжання ў рускай мове [6].

З часам нарманская тэорыя набыла ўсё больш праціўнікаў. Асабліва іх колькасць узрастала тады, калі нарманскую тэорыю “навучыць дзяржаўнасці” сталі выкарыстоўваць у гітлераўскай Германіі для доказу непаўнацэннасці славян і прыналежнасці германцаў да расы паноў (гаспод).

У савецкі час айчынныя гісторыкі цалкам разрушылі ідэі нарманскай тэорыі. Прапанова нямецкіх навукоўцаў весці адлік рускай гісторыі з часу прызвання варагаў у расійскай і беларускай гістарычнай навуцы была прызнана шкоднай [3, с. 44]. Падзеі і факты IX–X ст., пакладзеныя ў аснову гісторыі раннефеадальнай старажытнарускай дзяржавы, а таксама і перыяду пачатку ўласнай гісторыі Беларусі, якія выкладзены ў рускіх летапісах, нешматлікіх грэчаскіх і скандынаўскіх пісьмовых выданнях, народных сказаннях, выказванні нямецкіх навукоўцаў, прызнаны ненадзейнымі. Тэорыя, якая зыходзіць з магчымасці “навучыць дзяржаўнасці”, згодна з марксісцка-ленінскімі поглядамі, названа ідэалістычнай, што адпавядае ўзроўню развіцця дваранскай і часткова буржуазнай навукі [3, с. 44].

Узнікненне дзяржаўнасці на сваёй тэрыторыі, як і ў іншых месцах, савецкімі навукоўцамі разглядалася як вынік арганічна заканамернага, унутрана абумоўленага, паступовага прагрэсіўнага развіцця ўсіх народаў. Выказвалася слушная думка, што істотным этапам у стварэнні дзяржаўнасці ва ўсходніх славян у IX ст. з’яўлялася разлажэнне родаплемяннога ладу, станаўленне феадальных адносін, узнікненне класавага грамадства, вылучэнне дружыны князя і пераўтварэнне ўлады князя з родаплемянной у дзяржаўную. Дадзеныя перадумовы складваліся яшчэ ў VI ст. са з’яўленнем буйных племянных саюзаў, назва якіх захавалася ў летапісах (паляне, драўляне, улічы, ціверцы, крывічы, дрыгавічы, радзімічы, наўгародцы і інш.). На чале такіх племянных княжанняў стаялі князі і племянная знаць. Па сцвярджэнні навукоўцаў, саюзы плямён можна лічыць як пераходную палітычную форму, што падрыхтавала стварэнне раннефеадальных дзяржаў. Гэтыя дадзеныя гістарычнай навукі аб з’яўленні перадумоў стварэння дзяржавы на Русі ў выніку заканамернага сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця ўсходніх славян не змаглі абагульніць летапісцы старажытнасці, праігнаравалі іх і нямецкія гісторыкі. У канцы XVIII ст. летапісныя звесткі пра прызванне варагаў былі адрэдагаваны на карысць нарманскіх плямён. Нямецкія гісторыкі не прыдалі значэння такому важнаму факту летапісу, дзе гаворыцца

пра “раннія дзяржаўныя ўтварэнні – племянныя княжанні – у палян, драўлян, крывічоў-палачан, дрыгавічоў” [7, с. 8, 9, 14]. Таму і не зразумелі, што ў летапісным тэксце размова ідзе зусім не аб стварэнні дзяржаўнасці на Русі, а толькі аб з’яўленні варагаў у Новагародскай зямлі.

Абагульняючы гістарычныя працы, неабходна пагадзіцца з тымі навукоўцамі, якія лічаць, што ўплыў варагаў на ўтварэнне рускай дзяржаўнасці (калі ён меў месца) насіў акрэслены характар, пытанне аб этнічным паходжанні княжацкай дынастыі не з’яўляецца галоўным (варажская знаць лёгка і хутка асімілявалася з мясцовым насельніцтвам). Агульнапрызнанай трэба лічыць канцэпцыю, згодна з якой дзяржаўнасць не можа быць прадметам экспарту ці імпарту, гэта заканамерны вынік тысячагадовага гістарычнага шляху народа. Тое ж самае адносіцца і да праблемы станаўлення дзяржаўнасці беларускага этнасу. Калі давяраць “Аповесці мінулых гадоў”, то яшчэ пад 862 г. скандынаўскі князь Рурык, які прыняў уладу ў Ноўгарадзе, пры раздачы гарадоў “мужам сваім” накіраваў палачанам князя [2, с. 18]. Імя князя, які сеў у Полацку, не названа, верагодна, што як “муж” Рурыка, ён быў варагам. Згодна з летапісам Полацк як быццам бы трапляе з гэтага часу пад уплыў Ноўгарада. На падставе таго, што ў дагаворы Алега з грэкамі (907 г.) Полацк разам з іншымі гарадамі названы горадам, “где сидят подвластные Олегу князья”, у беларускіх крыніцах указваецца на тое, што пры пераходзе Алега, пераемніка ўлады Рурыка, з Ноўгарада ў Кіеў Полацкае княства, якое знаходзілася ў сферы інтарэсаў Ноўгарада, трапляла ў такія ж адносіны да Кіеўскай дзяржавы. У такім разе, хутчэй за ўсё, Полацк уваходзіў у дзяржаву з назвай Русь, межы якой пралягалі ад Карпат да берагоў Дняпра. Але адносіны з апошняй былі намінальнымі і абмяжоўваліся толькі стасункамі, якія прадугледжвалі ўдзел ва ўзаемавыгадных ваенных мерапрыемствах [8, с. 149]. Адначасова расійскі вучоны акадэмік Б.Д. Грэкаў у сваёй працы адзначае, што да падзей 980 г. Полацк ніколі не быў пад уладай Кіева [9, с. 295–296]. Другі знакаміты расійскі гісторык Б. Рыбакоў таксама падтрымлівае канцэпцыю незалежнасці Полацка ад Кіева. Падобную сітуацыю ён тлумачыць тым, што Смаленск быў самым аддаленым і паваротным пунктам палюддзя кіеўскіх князёў, якое ажыццяўлялася “па крузе” (было кругавым аб’ездам зямель) [10, с. 78]. Паколькі пасля 907 г. да 980 г. звестак аб падначаленым стане Полацка Кіеву ў пераліку падзей, што разгортваюцца вакол старажытнарускай дзяржавы, не ўзгадваецца, магчыма, гэта ёсць варыянт вольнага падыходу летапісцам да пераліку гарадоў, якія названы ў дагаворы. Дадзеная версія таксама існуе. У такім разе ўзнікае версія, што ўключаны ў дагавор Полацк трапіў замест Плоцка, што на Вісле.

Адасобленасць Полацкага княства ў перыяд 70–80-х гг. X ст. тлумачыцца аўтарамі паводзінамі полацкіх князёў трымаць свае землі ў незалежнасці ад Кіева [11, с. 158]. У 70-я гг. X ст., як адзначаецца ў беларускіх крыніцах, усёй Полацкай зямлёй адзінаўладна кіраваў Рагвалод, які, як сказана ў летапісе, “прыйшоў з-за мора” [8, с. 151]. Ёсць думкі, што ён славянскі князь. Імя Рагвалод чытаецца як “уладар рога”, у значэнні “ўладар мыса” [12, с. 25]. Безумоўна, пасля таго як рэчы скандынаўскага паходжання былі выяўлены пры археалагічных даследаваннях на тэрыторыі Полацка і Віцебска, цалкам адвяргаць прысутнасць тут скандынаваў нельга [13, с. 111–117]. У той жа час прызнаць, што паходжанне княжацкай дынастыі з’яўляецца варажскім і скандынавы адыгрывалі рашаючую ролю ў падзеях станаўлення тут дзяржаўнасці (што раўназначна прызнанню нарманскай тэорыі), будзе вялікай памылкай. Няма сумневу, што дзяржаўная арганізацыя ў дрыгавічоў, крывічоў, радзімічаў узнікае найперш як вынік ускладнення грамадскага жыцця.

Такім чынам, дзяржаваўтваральныя працэсы на беларускіх землях, станаўленне Полацкага, Тураўскага, Навагародскага і іншых беларускіх дзяржаў-княстваў адбываліся праз стварэнне матэрыяльнай і духоўнай культуры яе сталымі насельнікамі. Найбольш прымальнай трэба прызнаць парадыгму: вытокамі дзяржаўнасці і важнейшым цэнтрам палітычнай кансалідацыі на беларускіх землях быў крывіцкі горад Полацк. Для такога меркавання ёсць важкія аргументы: ужо ў IX ст. Полацк актыўна ўключыўся ў палітычнае жыццё ўсходнеславянскіх плямён і нараўне з Ноўгарадам і Кіевам змагаўся за лідарства, за права аб’яднання славян.

Разыходзіліся думкі навукоўцаў (разыходзяцца і сёння) не толькі пры разглядзе пытанняў аб прысутнасці варагаў на тэрыторыі Старажытнай Русі, іх значэнні для з’яўлення дзяржаўнасці, але і па яе першапачатковай назве і паэтапнасці фарміравання цэнтралізаванай дзяржавы. Больш за тое, адсутнасць цэльнай канцэпцыі і абгрунтаванай высновы па пытанні аб вытоках рускай дзяржавы, аб яе назве час ад часу станавілася полем палітычных спекуляцый. Такія прыклады ў гісторыі наглядаліся даволі часта, узнікаюць і сёння.

Так, пры ўскладненні адносін паміж Расіяй і Украінай на сучасным этапе кіеўскія палітыкі (пры падтрымцы навукоўцаў) паставілі на мэце знайсці доказ, што назва Русь (і вытворная ад яе Расія) з'яўляецца агульнапрызнанай назвай цяперашняй Украіны. Дзяржаўным арганізацыям Украіны афіцыйна прапанавана “заборонити вживання найменування «Росія»” (пры ўпамінанні Расійскай Федэрацыі. – *І.М.*), замінити його словом «Московія»”. У ліпені 2018 г. прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка заявіў, што князь Уладзімір 1030 гадоў назад хрысціў не Русь, а Украіну і такім чынам была створана ўкраінская царква, якая сёння, па яго словах, павінна стаць незалежнай.

Як бачна, некаторыя дзяржаўныя дзеячы Украіны, з падтрымкай асобных гісторыкаў і Канстанцінопальскага патрыярха, імкнуцца фарміраваць тую дзяржаўную ідэалогію і рэлігійную палітыку, што запатрабавана яе сучасным палітычным кіраўніцтвам. Для гэтага абапіраюцца на гістарычную навуку, яе інтэрпрэтацыю аб утварэнні ўсходнеславянскай дзяржавы з назвай Кіеўская Русь. Усе іншыя гістарычныя канцэпцыі па дадзеным пытанні ў разлік не бяруцца, паколькі гэта разбурае іх ідэалогію, якая прызначана фарміраваць “патрыётаў незалежнай дзяржавы”.

Уважлівае прачытанне крыніц паказвае, што гэта скажэнне гісторыі. Нагадаем: тэрмін “Кіеўская Русь” упершыню з'явіўся толькі ў першай палове XIX ст. у працы рускага і ўкраінскага гісторыка, батаніка і філолага М.А. Максімовіча “Откуда идет Русская земля”. У ёй дзякуючы выкарыстанню старажытных пісанняў даследуецца пытанне аб русах і варагах. Прычым знаёмства з гэтай і іншымі працамі дадзенага аўтара прыводзіць да дакладнай высновы: тэрмін “Кіеўская Русь” у сваім даследаванні М. Максімовіч ужывае ў вузкагеаграфічным сэнсе для абазначэння Кіеўскага княства ў адным радзе са словазлучэннямі “Чырвоная Русь”, “Суздальская Русь”, “Белая Русь” [14].

Прыхільнікамі такога падыходу на Беларусі з'яўляюцца гісторык і пісьменнік В. Ластоўскі, а таксама доктар гістарычных навук, прафесар Г.В. Штыхаў, гісторык М. Ермаловіч. Яны знаходзяць дадзеную канцэпцыю навукова абгрунтаванай. Катэгарычна выказваецца на гэты конт М. Ермаловіч. У сваёй працы “Старажытная Беларусь: полацкі і новагародскі перыяды” ён сцвярджае, што ў вывучаных ім крыніцах (летапісы, хронікі, старажытныя і самыя рэдкія кнігі) дзяржавы з назвай Кіеўская Русь ён не знайшоў. Згодна з яго даследаваннямі ў IX ст. уздоўж шляху, які атрымаў у летапісе назву “з варагаў у грэкі”, склалася усходнеславянская дзяржава [12, с. 56].

Такое меркаванне (а яно выказваецца зараз у шматлікіх публікацыях) цалкам пацвярджаецца першаснымі крыніцамі – дагаворамі паміж *Руссю* і *Візантыяй.* Напрыклад, у дагаворах 907 г. сказана “давать содержание прибывающим *из русских городов:* прежде всего из Киева, а также из Чернигова, Переяславля, Полоцка, Ростова, Любеча и прочих городов, ибо тем городам, где сидят подвластные Олегу князья”.

У дагаворы Русі з Візантыяй 911 г. зноў сказана, што ён заключаецца “ад имя русскага народа”. У пункце першым запісана “Мы, от (имени) русскага народа (ідзе пералічэнне прозвішчаў падпісантаў. – *І.М.*), посланные Олегом, великим князем русским и всеми подвластными ему светлыми боярами». Далей у тэксце размова вядзецца зноў жа аб рускіх людзях – рускіх хрысціянах, рускіх, што праводзяць гандлёвыя аперацыі, рускіх чэлядзінах.

Аб гэтым жа сведчыць Дагавор 944 г.: “Мы *от (имени) русскага народа,* послы и купцы, Ивор, посол Игоря, великого князя русскага и общие послы (ідзе пералік прозвішчаў. – *І.М.*), которые посланы Игорем, великим князем русским и всяким княжьем и всеми людьми *Русской земли*”. Далей у дагаворы запісана, што той дагавор, які заключаўся раней, з'яўляецца старым, “уже много лет как нарушенный”, новы дагавор закліканы “утвердить дружбу между греками и *русскими*”.

У дагаворы часоў княжання Святаслава (971 г.) дадзены кантэкст падмацоўваецца наступным тэкстам: “Я, (Святослав), *князь русский* (тут і вышэй выдзелена намі. – *І.М.*), как клялся, так и подтверждаю настоящим договором свою клятву: хочу вместе с подвластными мне русскими боярами и прочими иметь мир и прочную дружбу с Иоанном, великим цесарем греческим, с Василием и Константином, Богом данными цесарями, и со всеми вашими людьми до конца мира” [7, с. 19–25].

З тэкстаў дагавораў вынікае толькі адна выснова: пасля прыходу ў Кіеў Алега (882 г.) дзяржава, якую ён узначаліў, а затым і яго паслядоўнікі, у афіцыйных дакументах называецца Рускай, без слова Кіеўская. У далейшым назва дзяржавы не змяняецца. У сувязі з тым, што дыпламатычныя дакументы як старажытныя пісьмовыя помнікі прызнаюцца навуковай грамадскасцю, напрошваецца заканамерны вынік: старажытнаруская дзяржава насіла ў гэтыя часы назву Русь. У Кіеве знаходзіцца княжацкі пасад, а дзяржава распасціраецца на велізарнай тэрыторыі, у тым ліку ахоплівае і беларускія землі.

Рускія гісторыкі абазначылі першапачатковы перыяд гісторыі Русі/Расіі, калі яе цэнтр знаходзіўся ў Кіеве. Умоўнай датай стварэння старажытнарускай феадальнай дзяржавы яны лічаць 882 год, калі Алег з наўгародскім войскам і наёмнай варажскай дружынай захапіў Кіеў, і, па словах летапісца, “нача городы ставити, и уставы дани словенам, кривичам и мери”. Алег зацвердзіўся на землях дняпроўскіх крывічоў, замацаваў за сабой іх гарады Смаленск і Любеч. З часу захопу Кіева пад уладай Алега знаходзіўся ўвесь вялікі водны шлях “из варяг в греки”. У яго валоданні аказаліся землі паўночнай і паўднёвай часткі Русі. Па берагах воднага шляху з’явілася першапачатковая Руская дзяржава з пастаяннай цеснай сувяззю паміж Ноўгарадам і Кіевам. Галоўны князь трымае за сабой Кіеў, адначасова яму належыць і Ноўгарад. Аб’яднанне Ноўгарада і Кіева пад уладай аднаго князя – найважнейшы этап старажытнарускай дзяржаўнасці. Калі да ўзяцця Кіева Алегам магчыма было казаць пра існаванне на Русі дзяржаўнасці і дзяржавы, дык з 882 г. ёсць права казаць аб існаванні старажытнарускай дзяржавы з поўнай назвай Русь.

Алег аб’яднаў пад сваёй уладай два важнейшыя цэнтры ўсходняга славянства, пабудаваў гарады і ўстанавіў даніну ў плямён паўночных, потым падпарадкаваў сабе іншыя плямёны славянскія, якія жылі ад усходу і захаду ад Дняпра, у тым ліку драўлян, северян і радзімічаў. Пасля Алега яго палітыку далучэння славянскіх плямён і здымання з іх даніны працягвалі Ігар (911–945 гг.), княгіня Вольга (945–964 гг.), Святаслаў (964–972 гг.).

Цалкам фарміраванне дзяржавы на тэрыторыі Старажытнай Русі завяршылася з 980 па 1015 г. пры князю Уладзіміру. Да часу яго княжання гісторыкі адносяць і далучэнне Полацка да Русі. Страта незалежнасці Полацкам звязваецца з паходам Уладзіміра ў 980 г. і захопам горада. У сувязі з гэтым зноў паўстае пытанне аб ступені залежнасці Полацка ад Кіева да гэтага часу. Зусім незразумела, чаму імкненне Рурыка даць палачанам князя паставіла пад пагрозу інтарэсы кіеўскіх князёў Аскольда і Дзіра раней гэтага тэрміну: 865 ці 867 года. “Аповесць мінулых гадоў” сведчыць, што дзеянні Рурыка паставілі пад пагрозу эканамічныя інтарэсы Кіеўскага княства. Гэта ўсхвалявала кіеўскіх князёў Аскольда і Дзіра. Як паведамляецца ў Іпацьеўскім летапісе, яны здзейснілі паходы на крывічоў, ваявалі палачан і шмат шкоды ім нарабілі [15, с. 9]. Зусім незразумела, як гэта магло адбыцца. Згодна з летапісам Аскольд і Дзір былі “мужамі” Рурыка, якія вызвалілі зямлю палян ад даніны хазарам. Тут бачыцца супярэчнасць: іх хуткі выхад з падпарадкавання Ноўгараду, адкуль яны былі накіраваны ў Кіеў. У гэтым выпадку больш дасканалай магла б аказацца версія, заснаваная на пазнейшым летапісе: яны не былі варагамі, а патомкамі Кія. Таму і расправа з імі была такой суровай, Алег заманіў хітрасцю Аскольда і Дзіра з горада, забіў іх, захапіў Кіеў. Хаця адкінуць першую версію, што яны былі пасланы ў Кіеў Рурыкам, таксама нельга.

Пры Уладзіміру ў Старажытную Русь былі ўключаны амаль усе ўсходнеславянскія плямёны. Калі пагадзіцца з падобным ходам падзей, гісторыкам не будзе здавацца надзвычай складаным пытанне аб існаванні ў гэты час цэнтралізаванай адзінай старажытнарускай дзяржавы. Русь стала сапраўды буйнейшай дзяржавай Еўропы, мела раўнапраўныя партнёрскія адносіны з Візантыяй [16, с. 52]. Але зліццё зямель былых племянных саюзаў у адзіную старажытнарускую народнасць не было поўным і канчатковым.

Далейшага навуковага даследавання патрабуе паходжанне тэрміна “Русь”. Знакамітыя расійскія навукоўцы В.В. Ключэўскі, М.М. Ціхаміраў, Л.У. Чарапнін, А.А. Зімін лічаць, што Кіеўская Русь не была дзяржавай рускага народа, таму што яшчэ не існавала самога гэтага народа, а мелі месца толькі этнаграфічныя элементы, з якіх пасля другой паловы XI ст. пачаўся доўгі і цяжкі працэс фарміравання рускай народнасці. В. Ключэўскі пад уплывам даследаванняў прыхільнікаў нарманскай тэорыі распаўсюджваў тэрмін “Русь” на прышлы элемент, які быў звязаны з пануючым класам [16, с. 113]. Згодна з думкай вучонага, назва Русь мае, быццам бы, нарманскае паходжанне. Тады паўстае пытанне, з якой краіны прыйшлі варагі. Ёсць меркаванне, што Рурык з братамі, калі гэта было ў сапраўднасці, выйшаў з Прусіі, дзе са старажытных часоў Руснаю называецца Куркскі заліў, а паўночны рукаў Нёмана ці Мемеля – Руссаю, а іх наваколле – Паруссем. Другой нарманскай мясцовасцю, з якой маглі прыйсці варагі, называюць Каралеўства шведскае, дзе адна паморская вобласць здаўна называецца Рускаю (ROS Lagen). Так, да сённяшняга дня не зразумела, з якой жа мясцовасці выйшлі варагі. А магчыма назва Русь (“рось”) зусім не скандынаўскага паходжання? Як гіпотэзу можна прыняць, што гэта чыста славянскае племя, якое пражывала ў раёне ракі Рось. Пацвярджэнне таму знаходзім у персідскага гісторыка сярэдзіны IX ст. Ібн-Хададбеха, які пісаў, што “русы есть племя из славян”, такую ж выснову рабіў, як адзначалася вышэй, і М. Ламаносаў.

**Заключэнне.** Такім чынам, калі браць пад увагу ўсе навуковыя погляды аб утварэнні і эвалюцыйным станаўленні дзяржавы ва ўсходніх славян, што існуюць на гэты момант, можна ўбачыць: дадзены гістарычны этап нашай агульнай мінуўшчыны яшчэ не мае глыбокага асэнсавання. Версіі і тлумачэнні гісторыкаў пастаянна ўдасканальваюцца, яны носяць аўтарскую інтэрпрэтацыю і з'яўляюцца даволі супярэчлівымі. У расійскіх і беларускіх крыніцах пачатковы перыяд утварэння дзяржавы ва ўсходніх славян адлюстраваны недастаткова. У крыніцах замежных аўтараў яшчэ і сёння пануе новая нарманская тэорыя, якая не адмаўляе ролі ўнутраных фактараў у фарміраванні дзяржавы на Русі, але ўсё ж аддае перавагу ролі нарманаў у гэтым працэсе. Такі падыход да падзей прыніжае славян, чудзь, крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў. Мы падтрымліваем канцэпцыю навукоўцаў, што цалкам адвяргаць прысутнасць тут скандынаваў нельга, аднак, прызнаць, што паходжанне княжацкай дынастыі з'яўляецца варажскім і скандынавы адыгрывалі рашаючую ролю ў падзеях станаўлення тут дзяржаўнасці (што раўназначна прызнанню нарманскай тэорыі) будзе вялікай памылкай. Няма сумневу, што паступовы пераход ад родаплеменнога ладу да класавага і дзяржаўнага на землях усходніх славян абумоўлены не з'яўленнем тут вікінгаў, а эканамічнымі, сацыяльнымі і палітычнымі фактарамі. Больш верагодна прызнаць той погляд, што *дзяржаўнасць не можа з'явіцца вынікам экспарту ці імпарту, гэта заканамерны вынік шматвяковага гістарычнага шляху народа. Пераканаўчым сведчаннем таго,* што фарміраванне старажытнарускай палітычнай сістэмы і культуры на Русі адносіцца да больш ранняга даваражскага перыяду, з'яўляюцца рэчавыя і пісьмовыя крыніцы, значныя пасяленні: Пераяслаўль, Чарнігаў, Смаленск, Любеч, Растоў і інш., што тут былі створаны ўжо ў VIII ст. А ў IX ст. найважнейшымі цэнтрамі самастойных дзяржаўных адзінак на гэтых геаграфічных абсягах усходніх славян выступілі Ноўгарад, Кіеў і Полацк. Нават калі прыняць логіку самой легенды аб запрашэнні варагаў на княжанне, нельга не заўважыць тое, што гэта форма ўлады ўжо павінна існаваць. Тады трэба ўпэўнена сцвярджаць, што ў летапісным тэксце размова вядзецца зусім не пра стварэнне дзяржавы на Русі, а толькі аб з'яўленні на Новагародскай зямлі варажскай дынастыі.

Першапачатковае гістарычнае найменне дзяржавы з вялікай колькасцю зямель ад Ладажскага возера да вусця ракі Рось, правага прытока Дняпра і Ворсклы, зямель Заходняга Буга мела назву *Русь*. Пасля пераносу вялікакняжацкага цэнтра з Ноўгарада ў Кіеў назва дзяржавы заставалася без змен.

Старажытнаруская дзяржава з цэнтрам у Ноўгарадзе і Кіеве – гэта этап развіцця дзяржаўнасці адзінага народа, які ўключае ў сябе тых, хто называецца рускімі, украінцамі і беларусамі. Гісторыя Усходнеславянскай імперыі, якая да пачатку XIII ст. уключала ў сябе велізарную тэрыторыю, характарызавалася пастаяннымі спрэчкамі за прыярытэт на Русі з боку асобных княстваў, у тым ліку Полацкага. Полацкае княства з другой паловы IX ст. мела амаль поўную самастойнасць, па сваіх памерах і аўтарытэце знаходзілася на ўзроўні не толькі тагачасных княстваў Русі, але і многіх еўрапейскіх дзяржаў.

## Літаратура


1. Русская летопись с Воскресенского списка. – М., 1793. – Ч. 1.
2. Повесть временных лет. – М.–Л., 1950. – Ч. 1.
3. Павленко, Н.И. История СССР с древнейших времен до 1861 года: учебник для студентов пед. ин-тов / Н.И. Павленко, В.Б. Кобрин, В.А. Федоров; под ред. Н.И. Павленко. – М.: Просвещение, 1989. – 559 с.
4. Ключевский, В.О. Сочинения: в 9 т. / В.О. Ключевский; под ред. В.Л. Янина; предисл. В.Л. Янина, В.А. Александрова. – М.: Мысль, 1987. – Т. 1: Курс русской истории. – Ч. 1. – 430 с.
5. Соловьев, С.М. Сочинения: в 18 кн. / С.М. Соловьев; отв. ред. И.Д. Ковальченко, С.С. Дмитриев; вступ. ст. И.Д. Ковальченко, С.С. Дмитриева. – М.: Мысль, 1988. – Кн. 1. – Т. 1–2. – 797 с.
6. Древняя Россійская исторія отъ начала Россійскага народа до кончины великого князя Ярослава Первого, или до 1054 года, сочиненная Михайломъ Ломоносовымъ. – СПб., 1766.
7. Полное собрание русских летописей. – М., 1962. – Т. 2.
8. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2007. – Т. 1: Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. – 351 с.
9. Греков, Б.Д. Киевская Русь / Б.Д. Греков. – М.: Учпедгиз, 1953. – 341 с.
10. Рыбаков, Б.А. Мир истории. Начальные века русской истории / Б.А. Рыбаков. – М., 1987.
11. Барсов, Н.П. Очерки русской исторической географии начальной летописи / Н.П. Барсов. – Варшава, 1873.
12. Ермаловіч, М. Старажытная Беларусь: Полацкі і новагародскі перыяды / М. Ермаловіч. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 366 с.: іл.; Ігнатоўскі, У. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі / У. Ігнатоўскі. – Мінск, 1925.
13. Гуревич, Ф.Д. Скандинавские находки X–XI вв. на территории Белоруссии / Ф.Д. Гуревич // Скандинавский сборник. – Таллин, 1990. – № 33.
14. Максімовіч, М.А. Откуда идет Русская земля. По сказанию несторовой повести и по другим стариннымъ писаниямъ русскимъ // М.А. Максімовіч. – Въ Университетской Типографіі, 1837. – 169 с.
15. История СССР: учебник для студентов ин-тов культуры: в 2 ч. / под ред. Н.Е. Артемова. – М.: Высш. школа, 1982. – Ч. 1. – 512 с.
16. Ключевский, В.О. Неопубликованные произведения / В.О. Ключевский. – М., 1983.


*Паступіў у рэдакцыю 21.11.2018 г.*